Краязнаўства з'яўляецца важным рэсурсам грамадска-патрыятычнага станаўлення асобы, а краязнаўчая дзейнасць спрыяе яе ўсебаковаму развіццю. Менавіта таму краязнаўства сёння па праву лічыцца адным з асноўных накірункаў у рабоце бібліятэк ДУК "Пінская гарадская цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма".

Традыцыі, побыт, звычаі папярэдніх пакаленняў, мінулае і сучаснасць краю і многае іншае – ўсё гэта з'яўляецца тэмай шматлікіх бібліятэчных мерапрыемстваў. Дапамагаючы ў пошуку і замацаванні ведаў аб мінулым, бібліятэкі аднаўляюць страчаную гістарычную сувязь пакаленняў, іх пераемнасць.

Ужо на працягу 30 гадоў на базе аддзела абслугоўвання і інфармацыі Пінскай гарадской цэнтральнай бібліятэкі працуе **сектар краязнаўства**, дзейнасць якога накіравана на захаванне нацыянальных, этнічных, экалагічных, моўных традыцый краю, на выхаванне павагі да гісторыі, свят і абрадаў, што прыжыліся на тэрыторыі роднага краю, адраджэнне мясцовай культуры.

Асноўнай задачай сектара краязнаўства з'яўляецца збор матэрыялаў і інфармаванне карыстальнікаў аб гісторыі, сучасным становішчы і перспектывах развіцця краю, развіццё інтарэсу і беражлівых адносін да сваёй малой радзімы, арганізацыя і правядзенне сустрэч з цікавымі людзьмі, знаёмства з творчасцю пісьменнікаў і паэтаў роднага краю.

Дзейнасць сектара краязнаўства накіравана на выяўленне, збіранне і сістэматызацыю краязнаўчай літаратуры, стварэнне краязнаўчага фонду, здольнага задаволіць інтарэсы і патрэбы розных груп карыстальнікаў; стварэнне краязнаўчага даведачнага-бібліяграфічнага апарата; інфармацыйнае і даведачна-бібліяграфічная работа бібліятэк з краязнаўчай літаратурай; актыўнае фарміраванне зацікаўленасці да матэрыялаў аб родным краі.

Краязнаўчы фонд з'яўляецца асновай усёй краязнаўчай дзейнасці, дакументнай базай. Ім карыстаюцца для задавальнення краязнаўчых запытаў карыстальнікаў, для правядзення бібліяграфічнага інфармавання па краязнаўству, у дапамогу правядзення мерапрыемстваў і г.д.

Фонд сектара краязнаўства гарадской цэнтральнай бібліятэкі прадстаўлены рэдкімі выданнямі, кнігамі, брашурамі, краязнаўчымі папкамі, картамі, рукапіснымі матэрыяламі, сучаснымі каляровымі і чорна-белымі фотаальбомамі і складае на сённяшні момант больш за 2300 экзэмпляраў. Фонд кніжных выданняў дапаўняе перыёдыка: мясцовыя газеты "Пінскі

веснік”, “Полесская правда” і рэспубліканская “Краязнаўчая газета”. На старонках мясцовай прэсы заўсёды можна знайсці шмат інфармацыі аб цікавых і знамянальных падзеях, знакамітых земляках, а таксама гістарычныя факты, нарысы мясцовых краязнаўцаў, інтэрв’ю з сучаснікамі. Асаблівую гордасць сектара прадстаўляюць рэдкія матэрыялы аб Пінску, Пінскім раёне і



Палессі: А.Грушэўскі “Пинские акты” (15-16ст.), “Пинское Полесье” (14-16ст.), этнаграфічны сборнік “Пінчукі” пад рэдакцыяй Д.Булгакоўскага (1890г.), “Беларусы ў фотаздымках Ісака Сербава”(1911-1912гг.) і інш. У асноўным гэта ксеракопіі.

У фондах ёсць кнігі з аўтографамі, якія падарылі самі аўтары. У 2011 годзе было вырашана вылучыць такія кнігі асобна, быў створаны бібліяграфічны спіс гэтых дакументаў “З любоўю ад аўтараў”. Сярод іх можна знайсці кнігі фальклARыстаў, гісторыкаў, краязнаўцаў, а таксама зборнікі вершаў мясцовых паэтаў. Кожны год гэты спіс папаўняецца.



Акрамя кніг, перыядычных выданняў, вялікая ўвага адводзіцца вядзенню тэматычных папак, колькасць якіх складае больш за 20. Яны з’яўляюцца дапаўненнем да краязнаўчага фонду і картатэкі. Тэматыка іх самая разнастайная. Сярод іх можна назваць такія, як “Гісторыя Пінска”, “Іх імёнамі названы вуліцы горада”, “Культура”, “Пінск літаратурны”, “Землякі” і інш. Матэрыял у гэтых папках штогод папаўняецца і назапашваецца.




Кожная бібліятэка імкнецца да таго, каб назапасіць як мага больш інфармацыі аб сваім родным краі, а затым забяспечыць ёю карыстальнікаў. З гэтай мэтай наша бібліятэка ажыццяўляе краязнаўчую бібліяграфічную дзейнасць, якая ўключае арганізацыю і вядзенне краязнаўчага даведачна-бібліяграфічнага апарату, падрыхтоўку краязнаўчых бібліяграфічных

дапаможнікаў, краязнаўчае бібліяграфічнае абслугоўванне. Вялікая ўвага надаецца даведачна-бібліяграфічнаму апарату па краязнаўству. У інфармацыйна-бібліяграфічным сектары вядзецца БД "Краязнаўства", якая ўключае каля 14000 запісаў. Уключаныя ў БД артыкулы магчыма адшукаць і на сайце Пінскай гарадской цэнтральнай бібліятэкі (http://pinsklib.by/) ў раздзеле *"Электронный каталог"* па шэрагу прымет: аўтару, назве, тэме, прымеце персаналіі, па ключавому слову. Краязнаўчая картатэка адлюстроўвае ў розных аспектах краязнаўчы фонд і матэрыялы з перыядычнага друку.




Да значных падзей у гісторыі нашага горада, а таксама да юбілейных дат вядомых ураджэнцаў Пінска і мясцовых пісьменнікаў выдаюцца краязнаўчыя шорт-лісты.



Сектар краязнаўства таксама займаецца выданнем інфармацыйных матэрыялаў. Адной з традыцыйных форм работы з'яўляецца складанне краязнаўчага календара знамянальных і памятных дат, дзе адлюстроўваюцца юбілейныя даты па гісторыі нашага краю, юбілеі выдатных землякоў, прадпрыемстваў, гаспадарак і ўстаноў.




Адным з галоўных напрамкаў работы сектара краязнаўства ў Год гістарычнай памяці з'яўлялася адраджэнне нацыянальнай спадчыны беларускага народа, выхаванне пачуцця патрыятызму, цікавасці да гісторыі роднага краю, яго звычаяў і традыцый. Гэта работа адлюстравана ў розных масавых мерапрыемствах і была пабудавана ў цесным супрацоўніцтве з мясцовымі краяведамі, паэтамі і пісьменнікамі. Мерапрыемствы, якія праводзяцца ў сектары краязнаўства, розныя па сваёй форме і зместу.

У мінулым годзе споўнілася 100 гадоў з дня нараджэння ганаровага грамадзяніна горада Пінска Эдуарда Баляслававіча Нордмана, аднаго з арганізатараў і кіраўнікоў партызанскага руху ў гады Вялікай Айчыннай вайны.



Менавіта гэтай даце і была прымеркавана *гадзіна краязнаўства "Мужнасць застанецца ў вяках"*. Падчас сустрэчы з навучэнцамі горада мясцовы краязнаўца,

карэспандэнт газеты “Пінскі веснік” Вячаслаў Ільянкоў паведаміў пра гістарычныя звесткі будынка, у якім цяпер знаходзіцца каледж мастацтваў. Таксама ён расказаў пра Эдуарда Баляслававіча Нордмана, з якім быў знаёмы асабіста і не раз з ім сустракаўся. Асаблівая ўвага была ўдзелена мясцінам, звязаным з Пінскам і Піншчынай, дзе ў гады вайны праходзілі партызанскія баі.

Выхаванне ў карыстальнікаў павагі да роднай мовы, літаратуры, беларускіх свят, абрадаў і звычаяў з’яўляецца асноўным кірункам дзейнасці сектара краязнаўства. Традыцыйным стала правядзенне мерапрыемстаў, прымеркаваных Міжнароднаму дню роднай мовы. Так, у мінулым годзе ў межах акцыі “Мова маіх продкаў” адбылася *гадзіна роднай мовы “Размаўляем, чытаем, пішам па-беларуску”.* Падчас сустрэчы адбыўся прагляд і абмеркаванне мультфільмаў на беларускай мове, чытанне вершаў беларускіх і мясцовых паэтаў на беларускай мове. Дзеці таксама прынялі ўдзел у перакладанні слоў з рускай мовы на беларускую, інтэлектуальных гульнях і адгадванні загадак.



У рамках месячніка папулярызацыі нацыянальнай мастацкай літаратуры “Маіх радкоў няма без Беларусі” ў сектары краязнаўства



адбылася *гадзіна паэзіі “У сузор’і пінскіх паэтаў”.* Дзеці з апекунскіх і

мнагадзетных сямей і дамоў сямейнага тыпу былі азнаёмлены з творамі пінскіх паэтаў на беларускай мове. Мясцовая паэтэса Святлана Шаламіцкая, якая не толькі піша вершы на беларускай мове, але і размаўляе на роднай мове ў паўсядзённым жыцці, зачытала свае вершы для дзяцей, прадэманстравала фрагмент гульні-віктарыны “Гаворым па-беларуску”. Сюрпрызам для дзяцей стала знаёмства з калекцыяй жабак, якая налічвае больш за 600 экспанатаў.

Без ведання сваіх вытокаў немагчыма па-сапраўднаму палюбіць родны край, яго спадчыну, стаць патрыётам. Веданне гісторыі сваёй краіны дазваляе па-новаму асэнсаваць мінулае, сучаснае і ўявіць будучае, сфарміраваць неабходныя каштоўнасныя арыенціры. Таму выхаванне грамадзяніна, патрыёта ў сектары краязнаўства ажыццяўляецца праз вывучэнне сваіх каранёў і сваіх вытокаў.

З гэтай мэтай штогод у сектары краязнаўства праходзіць *тыдзень краязнаўства “Калі хочаш ведаць край – у сектар краязнаўства завітай!”*. У мінулым годзе мерапрыемствы ў рамках тыдня былі прысвечаны 925-годдзю



Пінска і арганізаваны для навучэнцаў школ і гімназій горада. Увазе наведвальнікаў была прадстаўлена кніжна-ілюстрацыйная выстава “Пінск – серца Палесся”, матэрыялы якой паведамлялі асноўныя перыяды развіцця гістарычнай і культурнай сталіцы Беларускага Палесся ад старажытнага часу да сучаснасці.

Падчас *гадзіны літаратурнага чытання “Чытаем вершы пра Пінск”* адбыўся прагляд відэароліка і электроннай прэзентацыі пра сталіцу Палесся. Дзеці з апякунскіх і шматдзетных сем'яў, дамоў сямейнага тыпу чыталі ўслых вершы пра Пінск на рускай і беларускай мовах мясцовых аўтараў В. Грышкаўца, Т. Лазнюхі, А. Бібіцкага, А. Шушко, А.Альфяровіча.




*Дзень інфармацыі “Па старонках краязнаўчага календара”* быў прымеркаваны да

найбольш значных юбілейных дат мінулага года. На працягу дня гучалі цікавыя гістарычня факты пра вядомых людзей, архітэктурныя будынкі, геаграфічныя аб'екты (Напалеон Орда, Рышард Капусцінскі, Іван Жалтоўскі, езуіцкі калегіум, г.п. Лагішын) і інш.

Падчас *гадзіны краязнаўства "Храмы Пінска"* навучэнцы азнаёміліся з электроннай прэзентацыяй "Пінск праваслаўны: з мінулага ў будучыню", і відэасюжэтам пра праваслаўныя храмы нашага горада.

925-годдзю Пінска быў прымеркаваны *урок краязнаўства "Усё пра цябе, любімы горад!"*,




у рамках якога быў прадэманстраваны фільм пра Пінск, электронныя прэзентацыі пра наш горад, праведзена віктарына. Бібліятэкарам быў праведзены агляд каля разгорнутай кніжнай выставы "Любімы сэрцу горад".

Для навучэнцаў пачатковых класаў у рамках тыдня была праведзена квэст-гульня "Ці ведаеш ты свой горад?". Для дарослых – пасяджэнне клуба "Благавест" "Вандруем па родным краі".

З мэтай папулярызацыі знакамітых мясцін роднага краю, фарміравання каштоўнасных адносін да культурнай спадчыны, сектарам краязнаўства неаднаразова былі арганізаваны *краязнаўчыя маршруты.*

Так, удзельнікі клуба "Благавест" адчулі сябе сапраўднымі паломнікамі



падчас наведвання храма, які будуецца ў гонар цэсарэвіча Алексія ў мікрараёне "Жылгарадок". Экскурсія адбылася ў рамках праекта "Пінск праваслаўны". Настаяцель будаванага храма іерэй Сергій Платніцкі расказаў пра гісторыю стварэння прыхода, пра будаўніцтва храма, пра майстэрні для людзей з

абмежаванымі магчымасцямі і многае іншае. Удзельнікі клуба пабывалі ўнутры храма, які будуецца, падняліся на клірас, а таксама наведалі практычна ўсе пабудаваныя памяшканні.

Наведвальнікамі клуба “Благавест” была здзейснена паломніцкая паездка па маршруту “Жыровічы–Русакова–Святая Воля”. Яшчэ яны наведалі і святую крыніцу – ўсе жадаючыя змаглі выкупацца ў купелі, а таксама набраць на святой вады. Цікавым было наведванне жаночага манастыра ў гонар прападобнага Амброзія Опцінскага ў вёсцы Русакова.



Удзельнікі клуба “Благавест” здзейснілі паездку ў вёску Сочыўкі Іванаўскага раёна. Пасля службы бацюшка расказаў пра гісторыю будаўніцтва храма. З цікавасцю слухалі пінчукі, як у храме з'явіўся Іверскі абраз Божай Маці, як заміраточыла, як вылечваліся людзі. Распавёў айцец Алег і пра іншыя святыні храма, пра абраз грузінскага Святога Гаўрыіла Ургебадзэ з часцінкай яго мантыі, пра жыццёвы шлях навамучаніка зямлі беларускай Канстанціна Жданава. Цікавым быў аповяд пра святара Васіля Катовіча, мемарыяльная дошка ў гонар якога ўстаноўлена ў храме.



У мінулым годзе таксама была здзейснена паломніцкая паездка па храмах Драгічынскага благачыння Брэсцкай епархіі. Удзельнікі клуба даведаліся шмат новай цікавай інфармацыі пра гісторыю храмаў, мясцовыя цудатворныя іконы, старадаўнія царкоўныя кнігі.



У рамках Тыдня краязнаўства адбылося пасяджэнне клуба “Благавест” – *“Падарожнічаем па родным краі”*. Прысутныя падзяліліся сваімі асабістымі ўражаннямі аб падарожжах па храмах, пра паездкі па благачынні Пінска-Лунінецкай епархіі, экскурсіі па родным горадзе.



Мерапрыемства прайшло ў цёплай атмасферы ўспамінаў аб сумесных паездках.

Традыцыйным у сектары краязнаўства стала правядзенне *краязнаўча-праваслаўныя чытанняў "К истокам своим возвращаемся"*, праведзеныя на базе духоўна-асветніцкага цэнтра "Вытокі" і сектара краязнаўства гарадской цэнтральнай бібліятэкі.

У мінулым годзе адбыліся VII праваслаўна-краязнаўчыя чытанні. У год гістарычнай памяці ў чытаннях прынялі ўдзел святары Пінска-Лунінецкай



епархіі, педагогі з Пінска, Іванаўскага раёна, госці з Мінска, краязнаўцы Піншчыны і Лунінеччыны, студэнты і школьнікі навучальных установ горада. Тэмы выступленняў, якія асвячаліся на чытаннях, былі прысвечаны жыціям святароў і гісторыі храмаў палескага краю. Усе даклады былі пазнавальнымі і карыснымі і пераклікаліся адзін з адным.

Такія мерапрыемствы, накіраваныя на ўзраджэнне і захаванасць гістарычнай і культурнай спадчыны краю, дапамагаюць змяніць адносіны да духоўна-краязнаўчай літаратуры і ўбачыць яе ролю як выхавальніка патрыятызму, талерантнасці, духоўна-маральных якасцей.

З мэтай папулярызацыі дзейнасці сектара краязнаўства, бібліятэкар арганізоўвае дні адчыненых дзвярэй, дні інфармавання. Такія дні праходзяць насычана і цікава. Наведвальнікі знаёмяцца з гісторыяй стварэння сектара, з тэматычнымі кніжнымі экспазіцыямі, цікавымі фактамі пра наш горад, знакамітых землякоў і іх творчай дзейнасцю.

Супрацоўнік аддзела ў сваёй рабоце выкарыстоўвае розныя формы і метады нагляднай, вуснай і пісьмовай папулярызацыі краязнаўчай літаратуры. Сярод наглядных форм работы самай распаўсюджанай з'яўляецца кніжная выстава, якая дапаўняе кожнае мерапрыемства і дапамагае больш поўна раскрыць фонд. Сярод іх – выставы-прапановы, выставы-прагляды, выставы-персаналіі, выставы-напаміны, к юбілейным і памятным датам, тэматычная выставы.

Да 925-годдзя горада Пінска была падрыхтавана разгорнутая *кніжная выстава-прагляд "Гісторыя*



*Пінска: ад старажытнасці да сучаснасці”*. На ёй размешчаны матэрыялы аб Пінску, пачынаючы з першага летапіснага ўзгадвання ў “Повести временых лет”, матэрыялы аб Грундвальскай бітве, аб атрыманні Пінскам Магдэбурскага права і герба, аб узвядзенні ў горадзе значных пабудоў. Адлюстраваны на выставе і матэрыялы аб Пінску падчас Першай і Другой сусветных войн, цяжкі пасляваенны перыяд, Пінск сучасны. Асобна выдзелены раздзел “Яскравая палітра землякоў”, прысвечаны мясцовым краязнаўцам, эколагам, фатографам, пісьменнікам і паэтам. На выставе шырока прадстаўлены кнігі, фотаальбомы, шорт-лісты, фотаздымкі, а таксама экспанаты з асабістай калекцыі краязнаўца Вячаслава Ільянкова.

Карыстаецца попытам *кніжная выстава “З любоўю ад аўтараў”,* якая з перыядычнасцю папаўняецца новымі выданнямі. На ёй прадстаўляецца толькі частка калекцыі кніг з фонду сектара краязнаўства. Сярод прадстаўленых выданняў – кнігі з аўтографамі вядомых беларускіх пісьменнікаў і паэтаў, мясцовых аўтараў, а таксама вядомых пінчукоў.






Неаднаразова арганізоўваюцца *кніжныя выставы-знаёмствы “Піншчына літаратурная”,* на якіх дэманстрыруюцца творы мясцовых літаратараў. Такія выставы карыстаюцца попытам у гараджан і на летняй бібліяпляцоўцы «#Library+creativity». Менавіта тут ёсць магчымасць пагутарыць з літаратарамі Піншчыны, паслухаць іх вершы і прозу.

Афармляюцца выставы і да

юбілейных дат мясцовых паэтаў з іх асабістымі зборнікамі, выдадзенымі ў розныя гады, крытычным матэрыялам па іх творчасці , а таксама шорт-лістамі, падрыхтаванымі інфармацыйна-бібліяграфічным сектарам.

З мэтай нагляднай папулярызацыі кніжных навінак афармляюцца выставы-прапановы “Навінкі краязнаўчай літаратуры”. Новыя паступленні краязнаўчай літаратуры таксама прадстаўляюцца ў выглядзе электроннай прэзентацыі на сайце Пінскай гарадской цэнтральнай бібліятэкі.




Сектар краязнаўства на працягу доўгага часу падтрымлівае цесныя сувязі з навучальнымі ўстановамі горада, мясцовым тэлебачаннем, рэдакцыяй мясцовай газеты. Дзейнасць цэнтра адлюстроўваецца і на сайце Пінскай цэнтральнай бібліятэкі (http://pinsklib.by/) ў раздзеле “Краеведение”. Тут можна знайсці інфармацыю аб новых паступленнях краязнаўчай літаратуры, аб мерапрыемствах, якія прайшлі ў сектары, матэрыялы аб нашых знакамітых земляках і інш.




Нельга не адзначыць сувязь і з такім цікавым чалавекам, як карэспандэнтам газеты “Пінскі веснік”, краязнаўцам і сцэнарыстам Вячаславам Ільянковым. Ужо шмат гадоў звязвае яго цеснае сяброўства з бібліятэкай. Вячаслаў Леанідавіч аказвае дапамогу ў пошуку краязнаўчага матэрыялу, цікавых гістарычных фактаў, прымае ўдзел у бібліятэчных мерапрыемствах.




Краязнаўчая дзейнасць насіла і носіць творчы, даследчы характар. Працягваецца пошук новых формаў і метадаў працы ў арганізацыі абслугоўвання чытачоў. Будзем спадзявацца,

што ў сектара краязнаўства наперадзе шмат новых сустрэч і адкрыццяў, а галоўнае чытачоў, якія цікавяцца гісторыяй свайго краю і любяць наш цудоўны горад Пінск, горад дзевяці стагоддзяў.